№ 11 (98)

# ПАХОДНЯ

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

Чэрвень 2009 г.

*Калонка рэдактара*

## Няма куды падзець грошы?




У чарговы раз 21 траўня ў Бялыніцкім раёне быў праведзены так званы “адзіны дзень інфармавання”, у чарговы раз дзесяткі кіраўнікоў рознага узроўня выехалі “у народ” распавядаць пра нашы дасягненні. Ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны гэта мерапрыемства штомесячна праводзіцца па аднолькаваму сцэнарыю, тэмы інфармацыйных матэрыялаў для гутарак таксама аднолькавыя паўсюдна. На гэты раз насельніцтву нашага раёна распавядалі пра такія “актуальныя” праблемы: “Бягучыя задачы і стратэгічныя мэты развіцця беларускага грамадства (Пасланне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь)”, “Папярэджанне дзіцячага дарожна-транспартнага траўматызму”, “Захаванне правілаў паводзін на вадзе – неабходная ўмова вашай бяспекі”. Вядома, асноўную ўвагу прапагандысты надавалі першай тэме, старанна даводзячы, як добра мы жывём, і як хутка станем жыць яшчэ лепш.

Я выдатна ведаю, што, як сказаў кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка, “крызісу ў нас няма”, гэта толькі ў іншых краінах з ім змагаюцца, як могуць, эканомячы літаральна кожны цэнт дзяржаўных грошай. Мабыць, гэтых самых грошай у нас у Беларусі няма куды падзець, усё насельніцтва забяспечана добрым жыллём, атрымлівае вялікія заробкі і пенсіі, састарэлыя і дзеці жывуць у раскошы, калі мы выкідваем вялікія сродкі на такія “важныя” мерапрыемствы, як “адзіны дзень інфармавання насельніцтва”. Незразумела толькі, чаму тады выпрошваем у каго толькі можна крэдыты, а калі ў нас пытаюцца:

***(Заканчэнне на ст. 2)***

## У Круглым зарабляюць больш

Раённыя аддзелы статыстыкі нарэшце паведамілі вынікі развіцця нашага рэгіёна ў першым квартале 2009 года. Агучаны розныя паказчыкі, аднак простых людзей найбольш хвалююць уласныя заробкі.

Атрымалась, што найлепшая сярэднемесячная налічаная зарабатная плата ў рэгіёне ў жыхароў Круглянскага раёна, за студзень-сакавік 2009 г. яна склала 755,8 тыс. рублёў альбо 133 % к аналагічнаму перыяду мінулага года. У сакавіку 2009 г. сярэднемесячная налічаная зарабатная плата ў жыхароў Круглянскага раёна павялічылась да 793,3 тыс. рублёў.

У Шклоўскім раёне сярэднемесячная налічаная зарабатная плата у студзені-сакавіку 2009 г. склала 685,5 тыс. руб., у сакавіку 2009 г. – 715,4 тыс. руб. (116,7 і 117,8 % к аналагічнаму перыяду мінулага года).

Намінальная налічаная зарплата галін эканомікі Бялыніцкага раёна ў студзені-сакавіку г. г. павялічылась на 18,3 працэнта к мінулагодняму ўзроўню і склала 694,3 тыс. руб.

Аднак жыхары ўсяго нашага рэгіёна зарабляюць значна менш, чым у сярэднім па Магілёўскай вобласці. Сярэднемесячная налічаная зарабатная плата па народнай гаспадарцы Магілёўскай вобласці ў студзені-сакавіку склала 801,6 тыс. руб., у сакавіку – 827,3 тыс. рублёў (тэмп росту суадносна 114,4 % і 112,4 %).

***Іван Барысаў***

# Няма куды падзець грошы?

*(Працяг. Пачатак на ст. 1)*

"А як аддаваць будзеце, хлопцы?", пачынаем крыўдзіцца і сварыцца. І чаму тады з чэрвеня, згодна ўказа Аляксандра Лукашэнкі, выдаткі дзяржбютжэта на гэты год скарацілі на 20 працэнтаў? Хутчэй за ўсё, лішніх грошай у краіне ўсё ж няма і нябудзе...

А калі сур'ёзна, то ніяк не магу зразумець, чаму кожны месяц у "адзіны дзень інфармавання" некалькі дзесяткаў чыноўнікаў з нашага раёна на дзяржаўных машынах раз'язжаюцца па розных гаспадарках, прадпрыемствах і населеных пунктах, каб на сустрэчах з насельніцтвам распавядаць аб дасягненнях роднай Беларусі. Магчыма, што ім больш няма чым заняцца на сваіх працоўных месцах. Складваецца ўражанне, што ў Бялыніцкім раёне людзі непісьменныя, не чытаюць дзяржаўных газет, не глядзяць тэлевізар і не слухаюць радыё. Вядома, гэта не так. У раённай газеце нашага "Зара над Друццю"рэгулярна змяшчаецца падрабязная інфармацыя аб тэмах "адзіных палітдней" і кожны жадаючы можа гэтыя матэрыялы прачытаць. Але чыноўнікам нашай шматлікай ідэалагічнай вертыкалі патрэбна паказаць, што яны нездарма атрымліваюць свае вельмі неблагія заробкі, таму і выкідваюцца вялікія дзяржаўныя сродкі на правядзенне "адзіных дней інфармавання". Лепш бы гэтыя грошы выдаткавалі на аказанне дапамогі шматдзетным сем'ям і састарэлым грамадзянам...Ну а члены шматлікіх "груп інфармавання насельніцтва", калі ім па асноўнаму месцы працы занятку не знаходзіцца, маглі б па некалькі дзён адпрацаваць на фермах даяркамі ці даглядчыкамі за жывёлай у "Іскры" ці "Падзевічах". Карысці было б нашмат больш, як і магчымасцей расказаць сялянам пра тое, як добра яны жывуць...

Наогул, чыноўнікаў розных рангаў ў нас развялось апошнім часам вельмі шмат, таму, на маю думку, можна значна скараціць іх колькасць, парадку ад гэтага стане толькі больш. А грошы з'эканомленыя (усё наша чынавенства атрымлівае добрыя заробкі і жыве вельмі нядрэнна) няхай пойдуць на падвышэнне жыццёвага ўзроўня простых людзей. Але гэта ўжо тэма іншага артыкула.

***Барыс Вырвіч***

## Так и сказал. А. Г. Лукашенко:

«До чего же мы дойдем, если борьбой с коррупцией занимаются люди, которые сами попирают законы и нормы морали? Что можно ожидать от государственных органов, уполномоченных выполнять контрольные и надзорные функции, если их сотрудники принимают от проверяемых «откупные»?»

«Свободы в Беларуси больше чем достаточно, и не менее, чем в других странах. Если кто-то пытается закрыть рот человеку, который объективно подаёт информацию, препятствуйте этому. Если где-то и есть ограничения свободы, то это не власть ограничивает, а сам народ».

***(БТ, ОНТ, БЕЛТА 2.08.2007 г.)***

## Амаль 100% выраблeнай прадукцыі ляжыць на складах

У Беларусі запасы гатовай прадукцыі на прамысловых прадпрыемствах на 1 мая 2009 года склалі 93,2% сярэднемесяцовага аб'ёму вытворчасці супраць 91,8% на 1 красавіка і 51,5% на 1 мая мінулага года.

Як паведамляе АФН са спасылкай на Белстат, у фактычных коштах складскія запасы дасягнулі 7 трыльёнаў 82 мільярдаў рублёў, павялічыўшыся з пачатку года на 42,9%.

Найбольшыя суадносіны запасаў гатовай прадукцыі і сярэднемесяцовага аб'ёму вытворчасці склаліся ў лёгкай прамысловасці - 198,9% або 594,1 млрд. (на 1 красавіка суадносіны складалі 195,7%, на 1 мая 2008 годы – 145,3%) і машынабудаванні і металаапрацоўцы - 173,7% або 3286,7 млрд. (адпаведна 166,3% і 81,4%).

У лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці суадносіны склалі 118,4% або 336,5 млрд. (109,9% на 1 красавіка 2009 года і 72,6% на 1 мая 2008 годы), у харчовай — 90,1% або 1267,8 млрд. (96,8% і 77,7%), у хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці — 81,9% або 802,2 млрд. (83,3% і 38,8%), у прамысловасці будаўнічых матэрыялаў — 73,1% або 266,4 млрд. (адпаведна 75,8% і 50,3%), у чорнай металургіі — 69,9% або 241,6 млрд. (59,9% і 5,2%), у паліўнай — 4,8% або 43,5 млрд. (6,1% і 5,9% адпаведна).

*Конкурс*

# Узнагароды пераможцам

У суботу, 30 траўня, у Бялынічах былі падведзены вынікі конкурсу дзіцячага малюнка "Дзеці Беларусі – за без'ядзерную будучыню".

Конкурс быў арганізаваны актывістамі антыядзернага руху Бялыніцкага раёна, сябрамі грамадскай ініцыятывы "Крок". Значную дапамогу ў набыцці падарункаў для маленькіх мастакоў аказала мясцовая суполка Грамадскага аб'яднання "Рух БНФ "Адраджэнне".

Удзел у конкурсе прынялі больш за дваццаць дзяцей у ўзросце ад 6 да 12 гадоў з Бялыніцкага раёна і горада Магілёва. У сваіх малюнках дзеці вельмі выразна выказалі сваё стаўленне да ядзернай пагрозы, якую стварылі іх далейшаму жыццю не вельмі разумныя дарослыя, дзякуючы якім у выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС больш чвэрці тэрыторыі Рэспублікі Беларусь падвергнулася радыяцыйнаму забруджванню. А зараз іншыя "вельмі разумныя" дарослыя плануюць пабудаваць на шматпакутнай беларускай зямлі атамную электрастанцыю, загнаўшы ў даўгавую кабалу на шмат гадоў наперад новыя пакаленні беларусаў. Чарнобыльская катастрофа гэтых людзей нічаму не навучыла...

Усе прадстаўленыя на конкурс малюнкі былі вельмі добрыя, адчувалася, што маленькія мастакі літаральна ўклалі ў творы сваю душу. Таму журы было цяжка вызначыць пераможцаў, кожны з удзельнікаў конкурсу заслугоўваў узнагароды. Пасля доўгіх дэбатаў лепшым быў прызнаны малюнак дзесяцігадовага хлопчыка з Магілёва Назара Кабодзька, які атрымаў у падарунак ад арганізатараў конкурсу цудоўны бінокль. Другое месца




**Алег Мяцеліца**

заняў малюнак Юрку Веніяміна, трэццяе месца падзялілі дзяўчынкі – Шахаленка Алеся і Шайтура Хрысціна.

Прызы за добрыя малюнкі таксама атрымалі пераможцы ў асобных падгрупах: Ісакаў Ілля з вёскі Ланькаў, Грык Люба з Магілёва, Куляшова Іра і Юрку Віялета з Бялыніч. Арганізатары конкурсу таксама адзначылі асобным падарункам (ліхтарыкам) самага маленькага мастака – шасцігадовага Дзіму Мамайка з Ланькава. А пасля заканчэння ўзнагароджвання пераможцаў усе ўдзельнікі конкурсу былі запрошаны за салодкі стол, дзе дзяцей частавалі цукеркамі і тартамі.

Як адзначыў актывіст антыядзернага руху з Бялыніч Алег Мяцеліца, ён вельмі ўсцешаны праведзеным конкурсам і актыўным удзелам у ім дзяцей не толькі з Бялыніцкага раёна, але і з Магілёва. Па яго словах, такія мерапрыемствы дазваляюць прыцягнуць увагу насельніцтва да той пагрозы, якую нясе неабдуманае выкарыстанне "мірнага атама". Гэта пытанне асабліва актуальна зараз, калі ўлады Беларусі без шырокага абмеркавання з беларускім народам збіраюцца будаваць у краіне ядзернага монстра, не маючы для гэтага ніякіх грашовых сродкаў.

**Іван Барысаў**

# «Уйдут» ли из правительства работающих пенсионеров?

Сегодня среди якобы принципиальных чиновников, которые свято чтут белорусские законы, пенсионеров не так уж и мало.

Так, недавно отметил 70-летний юбилей заместитель председателя Совета Республики Анатолий Рубинов.

Председателю Верховного суда Беларуси Валентину Сукало 16 августа этого года исполнится 67 лет.

Председатель Нацбанка Петр Прокопович в ноябре тоже будет отмечать 67-летие.

Председатель Комитета госконтроля Зенон Ломать не так давно праздновал 65-летие.

Министр экономики Николай Зайченко перешагнул пенсионный рубеж еще в минувшем году.

Министр спорта и туризма Александр Григоров еще в конце минувшего года перешагнул 60-летний рубеж.

Министру обороны Леониду Мальцеву станет пенсионером 29 августа этого года, в управляющий делами президента Николай Домашкевич - 4 сентября.

Впрочем, для высокопоставленных пенсионеров Закон о госслужбе не писан. Хотя там черным по белому написано: «Государственный служащий, достигший предельного возраста пребывания на государственной службе, освобождается от занимаемой должности по истечении того месяца, в котором он достиг указанного возраста»...

Ну и как, скажите, можно доверять людям при больших портфелях, если они сами нарушают закон?..

ПАХОДНЯ

# За 9 миллиардов Беларусь приобретет «головную боль на 300 лет»?

**На фоне разборок между Минском и Москвой на высшем уровне практически незамеченным прошло сообщение о том, что для строительства белорусской атомной электростанции выбран проект реактора санкт-петербургского «Атомэнергопроекта». Таким образом, сделан еще один шаг к возведению АЭС в нашей стране.**

Экономисты, политики и экологи сломали бесчисленное количество копий в спорах об эффективности и безопасности «мирного атома». Каждый стоит на своей точке зрения, как правило, подбирая именно те аргументы, которые ее обосновывают. Простому смертному определить, чьи доводы весомее, практически невозможно.

Однако случается, что люди проговариваются. И тогда кое-что тайное становится явным.

В конце мая генеральный директор Игналинской АЭС Виктор Шевалдин, человек, которого трудно заподозрить в антипатии к «мирному атому», дал интервью литовской «Экспресс-неделе». Среди всего прочего он заявил, что после закрытия станции с ней будет еще масса забот: «Должны быть построены соответствующие комплексы и могильники для захоронения отработанного атомного топлива. Их тоже надо будет содержать, так как проектом предусмотрено, что все накопившиеся радиоактивные отходы будут перерабатываться и храниться на площадке атомной станции. Подсчитано, что НАШ ОБЪЕКТ – ЭТО, ОБРАЗНО ГОВОРЯ, ГОЛОВНАЯ БОЛЬ ЛЕТ НА ТРИСТА».

Основным аргументом сторонников использования атомной энергии является ее дешевизна. Однако при этом они, как правило, умалчивают о том, что помимо огромных инвестиций в строительство станции впоследствии, когда она отработает положенный




срок, придется еще много лет нести расходы, связанные со снятием АЭС с эксплуатации. И если суммировать это все, покажется ли атомная энергия такой уж дешевой (даже, если вынести за скобки риски, связанные с возможными авариями)?

Напомним, что своих денег на атомную электростанцию у нас нет. Поэтому белорусские власти просят кредит у России — аж 9 миллиардов долларов (и это только на строительство АЭС). Не слишком ли велика цена за «головную боль», от которой не спасет никакой «Нурофен»?

***Вадим Ливнев, «Салідарнасць»***

## В Беларуси продолжает сокращаться численность сельского населения

В Беларуси продолжает сокращаться численность сельского населения. Об этом сообщила заместитель председателя Национального статистического комитета Елена Кухаревич на пресс-конференции в Минске.

**За прошлый год численность сельского населения уменьшилась на 58 тысяч и сейчас составляет 2,5 млн. человек. В сельской местности проживает 26% всего населения Беларуси.**

**Численность городского населения за 2008 год возросла на 40 тысяч и составила 7,2 млн. человек.**

**Как отметила Е.Кухаревич, снижение численности сельского населения вызвано его естественной убылью, миграцией в города, а также административно-территориальными преобразованиями, то есть включением в городскую черту сельских населенных пунктов. Так, в прошлом году в сельской местности умерло 32,1 тыс. человек, в города мигрировало 15,4 тысячи. Кроме того, сельские населенные пункты с общей численностью 10,8 тыс. человек были включены в городскую черту.**

**По словам специалиста, прирост городского населения объясняется миграцией, естественный приростом и теми же административно-территориальными преобразованиями. Так, за прошлый год в города мигрировало 23,5 тыс. человек, естественный прирост населения составил 6,1 тыс. человек.**

**Как отметила Е.Кухаревич, высокий уровень урбанизации населения характерен и для других европейских государств.**

*Анастасия Янушевская, БелаПАН*

*Наши кадры*

# Прокуратура информирует

Проверкой, проведенной прокуратурой Могилевской области по факту выделения Могилевским горисполкомом земельного участка Ильянову, установлено, что решением Могилевского горисполкома от 04.06.2007 ему был предоставлен земельный участок площадью 0,10 га по Загородному шоссе, 10-г, в г.Могилеве в пожизненное наследуемое владение для строительства и обслуживания жилого дома, как нуждающемуся в улучшении жилищных условий.

Согласно п.1.10 Указа Президента Республики Беларусь от 28.01.2006 № 58 «О некоторых вопросах изъятия и предоставления земельных участков» земельные участки для строительства в г.Минске, областных центрах и пригородных зонах этих городов капитальных строений (зданий, сооружений) без проведения аукционов предоставляются только гражданам Республики Беларусь, нуждающимся в улучшении жилищных условий.

Вместе с тем, как усматривается из материалов проверки, на момент выделения земельного участка Ильянов работал председателем Белыничского райисполкома и не состоял на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий ни по месту жительства, ни по месту работы. Он также не состоял на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий и в г.Могилеве. Следовательно, земельный участок мог быть приобретен им лишь с аукциона.

Прокурором области принесен протест на решение Могилевского горисполкома от 04.06.2007 в части выделения земельного участка Ильянов, который удовлетворен. Земельный участок изъят и включен в состав земель городской застройки.



***Александр Ильянов***

# Сколько стоит союзный чиновник?

**В русле общемировой тенденции на сокращение расходов на чиновников эксперты «Завтра твоей страны» проанализировали среднемесячные зарплаты чиновников, которые тратят бюджетные средства двух стран на туманные перспективы союза Беларуси и России.**

По информации «Завтра твоей страны», в начале 2009 года среднемесячная зарплата чиновников Постоянного комитета Союзного государства Беларуси и России составляла около 55 тыс. российских рублей или по нынешнему курсу – свыше 1650 долларов. Всего в данной структуре числятся около 110 человек. Таким образом, только в месяц и только на зарплаты союзным чиновникам из бюджетов двух стран – России и Беларуси – должно изыскиваться порядка свыше 180 тыс. долларов, а в год это — около 2,2 млн долларов.

Для сравнения: самая большая среднемесячная зарплата из тех структур, в которых на постоянной основе принимает участие наша страна, в аппарате ЕврАзЭС. Там она составляла в начале года 62 тыс. российских рублей или около 1900 долларов. В среднем такую сумму в месяц зарабатывали 100 штатных «евразэсовских» единиц.

Что касается исполкома СНГ, то в среднем его сотрудник (а всего их 220) в начале 2009 года зарабатывал около 1600 долларов в месяц.

Однако нужно учитывать, что в последних двух случаях вклад Беларуси в формирование зарплатного фонда значительно меньше из-за большего числа участников-государств в этих проектах.

*Грамадства*

# МАЛОДШЫ — ЗНАЧЫЦЬ, ЛЮБІМЫ...

Алег Бакулін ужо шмат гадоў узначальвае грамадскае аб'яднанне "Абарона правоў бацькоў і дзяцей". Здавалася б, ён заўсёды павінен быць на баку мужчын, якія па розных прычынах выхоўваюць дзяцей адны. Аднак Бакуліну не падабаецца Аляксандр Лукашэнка ў вобразе адзінокага бацькі.

***"Даволі частае з'яўленне прэзідэнта на публіцы са сваім пяцігадовым сынам патыхае нейкай паказухай,*** **— выказвае сваю прыватную думку Алег Бакулін.** ***— Дзеці павінны мець зносіны са сваімі аднагодкамі, а не толькі з целаахоўнікамі і нянькамі. У любога дзіцяці павінна быць нармальнае дзяцінства, а не афіцыйныя паездкі ў Ватыкан, Арменію альбо яшчэ куды.***

***Ці прыняў бы я кіраўніка дзяржавы ў арганізацыю, якой кірую? Думаю, так. Але спачатку я б задаў яму некаторыя пытанні. І не толькі пра прыватнае жыццё (хаця пра прыватнае жыццё кіраўніка дзяржавы гаварыць нямала). Мы шмат разоў звярталіся да ўлад з просьбай зацвердзіць свята "Дзень бацькі", пісалі пра парушэнні правоў інвалідаў і сірот. Але ў адказ нам прыходзілі толькі фармальныя адпіскі. А мы пра гэта пішам з 1995 года..."***

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

Ці акружаў А.Лукашэнка сваіх старэйшых сыноў Віктара і Дзмітрыя такой увагай і любоўю, як цяпер пяцігадовага Міколку?

**На гэтае пытанне выданне "Тут і цяпер" папрасіла адказаць лідэра Аб'яднанай грамадзянскай партыі** Анатоля Лябедзьку**.**

***— Я чатыры гады сядзеў побач з Лукашэнкам у Авальнай зале,*** **— узгадвае Анатоль Уладзіміравіч.** ***— Сябрамі ці прыяцелямі з ім мы ніколі не былі, але ўвесь гэты час я мог па-суседску назіраць за Аляксандрам Рыгоравічам. Магу сказаць, што нават падчас прэзідэнцкай кампаніі 1994 года я (і думаю, не толькі я) не ведаў, якая сям'я ў Лукашэнкі, ёсць у яго дзеці ці няма, якога ён родупаходжання. Такой інфармацыі не было і ў прэсе. Гэта зараз палітыкаў спрабуюць высвечваць праз грамадскі рэнтген, бо ў тых, хто займаецца палітыкай, не павінна быць нейкіх закрытых сфер жыцця. А тады, на жаль, пераважная большасць людзей (нават дэпутаты) проста не ўяўляла, што за душой у кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Лукашэнкі, які ён чалавек у сям'і. І, канешне, падчас работы ў Вярхоўным Савеце я ні разу не бачыў, каб Аляксандр Рыгоравіч прыязджаў у Мінск са сваімі сынамі Віцем ці Дзімам, вёў іх за ручку і паказваў сталіцу Беларусі — усё ж такі яны жылі на перыферыі. Такога не было. Хаця мы калі-некалі разам і ў футбол гулялі, і я заязджаў у гатэль "Кастрычніцкая", дзе тады жылі дэпутаты. І там таксама за чатыры гады я ні разу не бачыў побач з ім ні жонкі, ні дзяцей. І не чуў ад дэпутатаў-калег, каб нехта казаў пра ягоную жонку ці дзяцей.***

— А чаму цяпер, на Вашу думку, малодшы сын Лукашэнкі аказаўся ў вялікай палітыцы?



*А. Лукашэнка і сын*

***— Мажліва, гэта рэкамендацыі піяршчыкаў: трэба, каб такога суровага, быццам высечанага з каменнай глыбы Аляксандра Рыгоравіча нехта мякка адцяняў, выклікаў усмешку, станоўчыя эмоцыі. І лепш за ўсё з гэтай роллю спраўляюцца дзеці такога ўзросту, як сын Лукашэнкі. Яны выклікаюць толькі пазітыўныя эмоцыі. І Лукашэнка, відаць, пагадзіўся на такі эксперымент, каб адцяніць некаторыя адмоўныя бакі свайго іміджу. Як гэта атрымліваецца, можна ацэньваць па-рознаму. Часам выглядае нават гратэскна...***

— А чаму тыя ж піяршчыкі не параілі прэзідэнту Беларусі вывесці ў свет жонку? Гэта таксама дадало б пазітыву яго іміджу...

***— Калі Лукашэнка толькі стаў прэзідэнтам, у мяне было некалькі размоў з ім на гэтую тэму. Я спрабаваў гаварыць, што гэта вельмі моцны складнік, што жонка якраз атаясамлівае сабой сям'ю, што яна павінна з'яўляцца***

**(Заканчэнне на ст. 7)**

# МАЛОДШЫ — ЗНАЧЫЦЬ, ЛЮБІМЫ...

*(Заканч. Пач. на ст. 6)*



*Галіна Лукашэнка*

на публіцы побач з ім. Тым больш што ў мяне тады складвалася ўражанне, што Галіна Радзівонаўна вельмі сціплы чалавек. Падчас адной з паездак на Поўдзень я назіраў, як яна абсалютна непрыкметна сябе паводзіла. Але ён тады пра гэта і слухаць не хацеў. Мне здавалася, што ён крыху саромеўся сваёй жонкі. Казаў, што сям'я будзе перашкаджаць яму ў працы.

***— А чаму, на Вашу думку, маці Колі Лукашэнкі не бачна на публіцы? У інтэрв'ю адной з расійскіх газет Лукашэнка шчыра прызнаўся, што маці Міколкі — урач.***

— Наколькі я разумею, у Лукашэнкі ёсць афармленыя адносіны з Галінай Радзівонаўнай. У іх зарэгістраваны шлюб. Ненармальна мець шлюб з адной жанчынай, а з'яўляцца на публіцы з іншай.

**— А чаму б не скасаваць шлюб калі каханне скончылася? Ну, ці мала што можа адбыцца? Усе ж жывыя людзі!**

*— Думаю, развод трэба было афармляць раней, каб гэта выглядала нештучна. А зараз гэта будзе падробкай пад сітуацыю.*

**— Дарэчы, Вы амаль адзіны з беларускіх палітыкаў, які адкрыта можа разважаць на такія "пікантныя" тэмы...**

*— Відаць, у астатніх ёсць нейкія сямейныя праблемы.*

**ДАРЭЧЫ**

***Паходжанне пазашлюбных дзяцей устанаўліваецца ў залежнасці ад таго, як гэтае пытанне вырашаюць самі бацькі з улікам тых магчымасцей, якія прадастаўляе заканадаўства. Бацькі могуць падаць агульную заяву аб бацькоўстве ў органы рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану, рэгістрацыя дзіцяці можа таксама адбывацца на падставе рашэння суда. Калі ў дзіцяці няма законнага бацькі, яго запісваюць на прозвішча маці.***

ЭКСПЕРТЫЗА

Як царква ставіцца да пазашлюбных дзяцей?

**Прадстаўнікі праваслаўнай і каталіцкай царквы, да якіх звярнуўся карэспандэнт "Тут і цяпер", сказалі, што Бог любіць і шануе ўсіх дзетак без выключэння: *"З даўніх часоў дзеці лічыліся Божым благаслаўленнем, а бяздзетнасць — праклёнам".***

**А вось на тэму пазашлюбнага дзіцяці ў кіраўніка дзяржавы святары размаўляць катэгарычна адмовіліся.**

**Між тым пасля сустрэчы А.Лукашэнкі з Патрыярхам Маскоўскім і Усяе Русі Кірылам у народзе сталі казаць пра тое, што кіраўнік Рускай Праваслаўнай царквы быццам бы зрабіў заўвагу Аляксандру Рыгоравічу наконт таго, што нельга ў яго высокім статусе з'яўляцца на публіцы з незаконна народжаным сынам...**

ЦІКАВЫ ФАКТ

**У дэкларацыі аб даходах і маёмасці, якую запаўняў А.Лукашэнка напярэдадні апошніх прэзідэнцкіх выбараў, імя Колі Лукашэнкі наогул не ўзгадвалася. Хаця ў згаданай паперы былі пералічаны нават дзве ўнучкі і ўнук кіраўніка дзяржавы, якія "не мелі даходаў за 2005 год і не валодаюць уласнасцю".**

**Упершыню на публіцы А.Лукашэнка з Міколкам з'явіўся ў мінулым годзе — ён узяў дзіця з сабою на суботнік у спарткомплекс "Мінск-Арэна".**

**Некаторыя аналітыкі выказвалі думкі аб тым, што пазашлюбны сын прэзідэнта насіў прозвішча сваёй маці — Ірыны Абельскай. Якое прозвішча зараз мае пяцігадовы Мікалай, дакладна невядома. Не выключана, што Аляксандр Рыгоравіч мог даць яму сваё прозвішча і ўсынавіць яго.**

***Іван ЦЮРЫН, спецыяльна для svabodaby.net***

## Анекдот дня

- Як ты магла падумаць, што пасля цябе я здолею палюбіць іншую жанчыну?! Цяпер я іх усіх НЕНАВІДЖУ!!!



# Валюты не хапае. Нацбанк абяцае

**Эксперты не вераць, што Нацбанк бліжэйшым часам здолее вырашыць праблему з наяўнай валютай. Наадварот, праблемы толькі пачынаюцца.**



Апошні тыдзень у Беларусі назіраецца рэкае павелічэнне попыту на валюту. Грошай у абменніках катастрафічна не хапае, што яшчэ больш павялічвае ажыятаж. Нацыянальны банк абяцае, што сітуацыя на рынку наяўнай валюты будзе урэгуляваная цягам тыдня.

Аднак незалежныя эксперты кажуць, што сапраўдныя праблемы з доларамі і еўра ў Беларусі толькі пачынаюцца. Паводле эканаміста **Льва Марголіна,** пасля зімовай дэвальвацыі рубля на 20 адсоткаў людзі больш не вераць ураду і спяшацца перавесці свае "драўляныя" зберажэнні ў свабодна канверуемую валюту:

*- Я думаю, што насамрэч людзі ўжо трохі паразумнелі пасля новага году. Яны разумеюць, што калі ёсць адмоўнае знешнегандлёвае сальда ў эканоміцы, калі амаль кожны дзень попыт на біржы ўтрая перавышае прапанову, то тым людзям, якія больш-менш разбіраюцца ў эканоміцы, усё становіцца ясна. А гэтыя людзі жывуць не ў беспаветранай прасторы, у іх ёсць родныя, сваякі, сябры, з якімі яны дзеляцца гэтай інфармацыяй. Таму, калі людзі яшчэ даведаліся, што Расія фактычна адмовіла ў прадастаўленні валютнага крэдыту, то ўсім адразу стала зразумела, якія могуць быць наступствы. І яны пачалі скупаць валюту.*

Акрамя таго, як адзначыў эксперт, летам попыт на замежныя грошы толькі павялічваецца, прычам, незалежна ад таго, ці ёсць у краіне крызіс ці няма.

*Кастусь Вансяцкі, Радыё Рацыя, Менск.*

**Аляксандр Чубрык: «Сёння беларускую эканоміку ўжо нічым з крызісу не вывядзеш»**

*Наша эканоміка ўсё больш і больш упадае ў крызіс, - кажа эканаміст* ***Аляксандр Чубрык****. - Ламаецца стары сацыяльны кантракт, трэба неяк суцяшаць народ. А як гэта зрабіць - пакуль у нас не ведаюць. Лібералізаваць эканоміку? Гаворка ідзе аб тым, што гэты крызіс проста паказаў слабыя месцы беларускай эканомікі. А іх у нас, як кажуць, вышэй за дах. І ўсе яны, так або інакш, звязаныя з тым, што наша эканоміка працавала па сістэме, калі яна ведала, што трэба вырабляць. А не людзі гэта ведалі. Але эканоміка Беларусі - гэта эканоміка, якая вялікую частку сваіх тавараў прадае на экспарт. І, калі экспартныя рынкі скарачаюцца, то ці будзе тут адбывацца нейкая лібералізацыя? Таму што знешнія рынкі як абвальваліся, так і будуць абвальвацца. Так што зараз, на мой погляд, беларускую эканоміку нічым з крызісу не вывядзеш»,*

# Канцэрт у Бялынічах

Вечарам 30 траўня ў Бялынічах адбыўся канцэрт вядомых беларускіх выканаўцаў Алеся Камоцкага і Юрыя Несцярэнкі.

Алесь і Юрый выступілі перад бялынічанамі ў памяшканні папулярнага мясцовага кафэ "Белыя росы". Канцэрт адбыўся ў рамках кампаніі "Будзьма беларусамі!", дзякуючы якой жыхары невялікіх беларускіх мястэчак маюць магчымасць сустрэцца з вядомымі беларускімі выканаўцамі і навукоўцамі. Паслухаць спевакоў прыйшло некалькі дзесяткаў бялынічан, не вельмі вялікае памяшканне кафэ было запоўнена цалкам.

Вельмі цёпла быў сустрэты слухачамі Юрый Несцярэнка, які нарадзіўся ў Бялынічах і заўсёды карыстаецца папулярнасцю сярод сваіх землякоў. На канцэрце прысутнічала шмат асабістых знаёмых Юры, людзей, з якімі ён разам вучыўся ў школе.

Алесь Камоцкі да гэтага часу ў Бялынічах ніколі ня быў, але ўражанні ад мястэчка ў яго самыя добрыя: "Бялынічы – спадабаліся. Акуратны, прыемны гарадок". Неабхона адзначыць, што песні ў выкананні Алеся таксама не аставілі абыякавымі мясцовых слухачоў.

Пасля заканчэння канцэрта кожны з гледачоў меў магчымасць атрымаць аўтограф любімага выканаўцы, набыць дыскі з запісамі песняў у іх выкананні.

***Барыс Вырвіч***

WWW
http://ipcentr.org/
САЙТ ІНФАРМАЦЫЙНА-ПРАВАВОГА ЦЕНТРА

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна

Бялыніцкі раён, в. В.Машчаніца. тэл. 37-110. Рэдактар Вырвіч Б.І. Наклад. 299 асобнікаў